**2008 год**

**Варабей, Н. Кірмашовы гандаль у Беларусі ў першай палове XIX стагоддзя / Наталля Варабей // Беларускі гістарычны часопіс. – 2008. - №6. – С.49-56.**

У Гродзенскай губерні ў першай палове XIX ст. праходзілі наступныя кірмашы: Зэльвенскі (Ваўкавыскі павет), Пакроўскі (Брэсцкі і Слонімскі паветы), Свіслацкі (Ваўкавыскі павет), Успенскі (Гродзенскі павет), Кантрактовы (Гродна), Святога Якава (Брэскі павет), Мікалаеўскі (Ваўкавыскі і Гродзенскі паветы). Нагадаем, што, паводле прывілея 1496 г. вялікага князя ВКЛ Аляксандра, Гародня атрымала права ладзіць кірмашы, аднак да 1845 г. яны амаль не праводзіліся.

Асноўную ролю ва ўнутраным гандлі Гродзенскай губерніі адыгрывалі местачковыя кірмашы. Самым значным з іх быў Ганненскі ў Зэльве. Прывілей на арганізацыю кірмашу быў дадзены роду Сапегаў 2 мая 1721 г. каралём Рэчы Паспалітай Аўгустам II. Кірмаш доўжыўся месяц – з 25 ліпеня па 25 жніўня на гандлёвым двары недалёка ад ракі Зэльвянка. Пакупнікі і гандляры з’язжаліся не толькі з Гродзенскай, але і з суседніх Віленскай, Мінскай, Валынскай і Ковенскай губерняў. Былі “госці” з украінскіх зямель (Кіеўскай, Харкаўскай, Чырнігаўскай губерняў) і гарадоў цэнтральнай часткі Расіі (Масквы, Калугі, Тулы, Смаленска, Курска). Сярод удзельнікаў кірмашоў былі і купцы з Аўстрыі, Прусіі, Італіі, Даніі, Швецыі, гандляры, сяляне і памешчыкі Царства Польскага. Такім чынам, Ганненскі кірмаш меў агульнаімперскае і міжнароднае значэнне.